**Паважаныя наведвальнікі!**



Мы вітаем Вас тут, у нашай царкве Петры, на раздіме евангельска-лютэранскай царкоўнай абшчыны Петры-Мікалаі цу Фрайберг. Наша абшчына вызначаецца інтэнсіўнай працай з дзецьмі і моладдзю, актыўнай сумеснай працай удзельнікаў абшчыны ў хоры, хатніх кругах і іншых групах абшчыны, такіх як царкоўным хоры хлапчукоў, абшчынах моладзі, групах людзей пажылога ўзросту, а таксама шматлікімі музычнымі святамі.

**Унутраняе памяшканне:** Вам напэўна кінецца ў вочы незвычайнае сучаснае афармленне ўнутранняга памяшкання нашай царквы. Галоўны неф з’яўляецца адначасова месцам богаслужэння, абшчыннай залай і залай для святаў. Пад эмпорамі знаходзяцца памяшканні абшчыны: пакой вучэння Хрыста, пакой моладзі і памяшканне музыкі. Сюды вельмі пластычна ўпісваецца карціна “Царква ў царкве”. Кухня і іншыя групавыя пакоі знаходзяцца вакол карціны. У былым харавым памяшканні праводзяцца шматлікія выставы.

Значныя часткі ўнутранняга памяшкання, такія як месца аргана і царкоўнай кафедры, стварыў старэйшына Ёхан Крысціан Файгэ пасля вялікага гарадскога пажару 1728 года. Акрамя гэтага яму таксама прыналежыць афармленне дрэздэнскай жаночай царквы. Тэадор Квенцін значна змяніў у 1896 годзе унутраняе памяшканне нашай царквы. З 1974 па 1986 гг. ў сувязі з аб’яднаннем гарадскіх абшчын Св.Петры і Св. Мікалая адбывалася перабудова царквы да сучаснага выгляду.



**Фрыдрых Прэс:** Знакаміты праз афармленне сакральных будынкаў мастак Фпыдрых Прэс (1904–1990) распрацовываў з 1974 па 1986 гг.унутраняе памяшканне нашай царквы. Шэсць скульптур пад эмпорамі, якія прадстаўляюць абшчыны, накіравалі свае погляды на алтар і вялікую фігуру на шкляной сцяне: “Хрыстос, які зноў вярнуўся, – уладальнік свету”. Мастак сам назваў скульптуру харавога памяшкання, якая прадстаўляе Хрыстоса як пакутуючага служку Бога, “Апошні крык”.“ (Jes. 52, 13–).

**Арган Готфрыда Зільбермана:** Наступную асаблівасць можна пабачыць на заходняй эмпоры. Арган нашай царквы Петры быў зроблены ў 1735 годзе Зільберманам. У гэтым інструментце ён упершыню ажыццявіў сазрэлую канцэпцыю сваёй позняй фазы творчасці Канцэпцыя сваім урачыстым гучаннем мела прыкметы позняга барока.



Арган са сваімі 32 гучнымі рэгістрамі з’яўляецца самым вялікім арганам з дзвюма клавіятурамі, які пабудаваў Зільберман. Пасля змен у 19–20 стст. у 1993/1994 ён зноўку наблізіўся да свайго арыгінальнага стану. Вялікая завяршальная рэстаўрацыя змагла быць скончанай ў ліпені 2007 года і садзейнічала вяртанню аргану былой музычнай пышнасці. Арган Зільбермана – ідэальны, карыстаючыся попытам на нацыянальным і міжнародным узроўні інструмент для інтэрпрытацыі твораў пачынаючы ад часоў барока і да твораў арганнай музыкі Фелікса Мендэльсона-Бартольдзі.

З мая па кастрычнік кожную сераду пасля абеду можна пачуць гульню аргана Зільбермана. Вядома ў Вас ёсць магчымасць прыняць ўдзел ў слуханнях альбо правытных арганных экскурсіях і, адпаведна, замовіць маленькія канцэрты.

**Будынак і Званы:** Прыходская царква Святога Петры была пабудавана на самым высокім месце ўнутранняга горада да 1190 года як раманская базіліка, астаткі якой бачны яшчэ ў харавым памяшканні. Царква вызначае сваім становішчам, а таксама смаім размешчанным уступамі дахам заходняй вежы эпохі барока, якая завяршаецца доўгім шпілем, сілуэт горада. Вялікі звон быў зроблены ў 1487 годзе Освальдам Хілігерам і важыць 3850 кг. Малы звон вагай 1940 кг. быў зроблены яго ўнукам Вольфам Хілігерам у 1570 годзе. Абодзьва званы клічуць з рестаўраванай у 2005 годзе звонавай вежы да богаслужэння. Меншыя званы можна пачуць некалькі разоў у дзень з вежы Петры.

**Вежы:** у вызначаныя гадзіны, а таксама пры дамове магчымы пад’ем на самую высокую 72-метровую вежу старога горада вежу Петры.

---

Пры наяўнасці дадатковых пытанняў ахвотна знаходзімся ў Вашым распараджэнні. Святара можна знайсці: pfarrer@petri-nikolai-freiberg.de альбо цел. +49 3731 247859; супрацоўнікі царквы Петры – 34188. Больш дакладную інфармацыю пра нашу абшчыну, будынак царквы, арган, а таксама графік богаслужэнняў і мерапрыемстваў Вы знойдзіце www.petri-nikolai-freiberg.de!

**Беларуская мова**
**Weißrussisch**

v2.00

Вялікі дзякуй за інтарэс

Кірайніцтва царквы царкоўнай абшчыны Петры-Мікалай цу Фрайберг

*Übersetzung: Aleksander Lakhai, Büroleiter der Botschaft der Republik Belarus in Deutschland – vielen Dank!*